# ЛАЎРЭАТЫ СКАРЫНАЎСКІХ НАВУКОВЫХ ЧЫТАННЯЎ 1992 ГОДА

**На конкурс навукова-даследчых работ 1992 года, як ужо паведамлялася ў газеце «Гомельскі універсітэт», было пададзена 11 прац, якія былі прадстаўлены для рэцэнзій у розныя арганізацыі. Усе яны атрымалі высокую адзнаку рэцэнзентаў. Конкурснай камісіі прадстаяла нялёгкая задача: з лепшых выбраць дастойныя звання пераможцаў. Па ўзгадненню конкурснай камісіі з вучоным Саветам універсітэта пераможцамі конкурсу на лепшую навукова-даследчую работу і лаўрэатамі Скарынаўскіх навуковых чытанняў 1992 года сталі:**











**КАЗЛОВА Раіса Міхайлаўна, дацэнт кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства, доктар філалагічных навук.** Цыкл прац па рэканструкцыі і этымалагізацыі праславянскай лексікі, распрацоўка тэорыі структуры праславянскага слова.

Этымалагічныя вышукі Р. М. Казловай базіруюцца на шырокім дыялектным, гістарычным, анамастычным матэрыяле. Працы пазбаўлены поўнасцю суб'ектыўнага падыходу, нават у тых выпадках, калі аўтар спрачаецца з агульнапрызнанымі аўтарытэтамі. Этымалогіі, прапанаваныя Р. М. Казловай, даказальныя і пераканаўчыя. Аўтар цыкла прац паўстае не толькі як славіст-этымолаг, але і як спецыяліст у вобласці фанетыкі, словаўтварэння, лексікалогіі. Цыкл прац з'яўляецца важкім укладам у славянскае мовазнаўства па значнасці атрыманых вынікаў. Скрупулёзнасць і добрасумленнасць даследавання прывялі Раісу Міхайлаўну да заслужанага звання лаўрэата Скарынаўскіх чытанняў.

**ШАЙМУРАТАЎ Рафат Вафаевіч, прафесар кафедры вышэйшай матэматыкі, доктар тэхнічных навук.** Цыкл прац «Матэматычнае прагназіраванне зон малярухомай нафты».

У пяці працах цыкла выкладзены вынікі больш чым 20-гадовых навуковых даследаванняў аўтара па рацыянальнай тэхналогіі кантролю і рэгулявання распрацоўкі нафтавых месцанараджэнняў Рэспублікі Беларусь шляхам матэматычна абгрунтаванага прагназіравання і змяншэння зон малярухомай нафты ў калектарах трэшчынна-поравага тыпу. У працах падрабязна выкладаюцца матэматычная пастаноўка і рэалізацыя гэтай праблемнай задачы з улікам папярэдніх умоў эксплуатацыі залежаў, краявых і дадатковых умоў на свідравінах месцанараджэнняў. Вынікі рашэння дыферэнцыйных ураўненняў разам з пералічанымі ўмовамі дазваляюць тэарэтычна абгрунтаваць поўную карціну фільтрацыйнага патоку з мэтай выдачы практычных рэкамендацый па змяншэнню зон малярухомай нафты. Ідэі, распрацаваныя Р. В. Шаймуратавым, шырока выкарыстоўваюцца ў нафтавай практыцы Рэспублікі Беларусь.

**БАРЫС Якаў Сяргеевіч, дацэнт кафедры дыферэнцыйных ураўненняў, доктар фізіка-матэматычных навук.** Цыкл прац «Пабудова квазілінейных інтэгральных разнастайнасцей».

У цыкле прац вывучаюцца прыблізныя квазілінейныя інтэгральныя разнастайнасці і іх прыватныя выпадкі — прыблізныя абмежаваныя і афінныя інтэгральныя разнастайнасці. З дапамогай прыблізных інтэгральных разнастайнасцей прапанаваны канструктыўны падыход даследавання інтэгральных разнастайнасцей, што дазваляе развіць лакальныя метады іх пабудовы. У гэтым напрамку ўказана агульная схема абгрунтавання аналітычных метадаў тэорыі інтэгральных разнастайнасцей, якія ўключаюць як доказ тэарэм існавання інтэгральных разнастайнасцей, так і атрыманне адзнак хібнасці прыблізных разнастайнасцей. Атрыманы новыя вынікі па існаванню інтэгральных разнастайнасцей у разліковa-нарміраваных прасторах. Вынікі цыкла прац маюць навуковы інтарэс, які выражаецца ў стварэнні новага накірунку ў тэорыі інтэгральных разнастайнасцей дыферэнцыйных сістэм — прыблізных інтэгральных разнастайнасцей.

**САПЕГІН Леанід Міхайлавіч, загадчык кафедры батанікі і фізіялогіі раслін, доктар біялагічных навук, прафесар.** Цыкл прац «Эколага-фларыстычная класіфікацыя лугавой раслінасці пойм Беларускага Палесся і яе гаспадарчае выкарыстанне».

Аўтар працы прымяніў метад эколага-фларыстычнай класіфікацыі Браун-Бланке для класіфікацыі лугавой раслінасці ў поймах рэк Беларускага Палесся. Ім складзены прадромус поймавых лугоў, уключаючых 5 класаў, 10 парадкаў, 12 саюзаў і 23 асацыяцыі, з іх 15 новых. На падставе эколага-фларыстычнай класіфікацыі распрацавана гаспадарчая тыпалогія, уключаючая 10 тыпаў лугоў. Раду гаспадарак Гомельскай вобласці перададзены практычныя рэкамендацыі па рацыянальнаму выкарыстанню поймавых лугоў і эфект укаранення вельмі значны, што пацверджана радам актаў аб укараненні. Праца, прадстаўленая на конкурс, з'яўляецца прыкметнай вяхой у развіцці практычнай фітацэналогіі беларускай батанічнай навукі.

**КАЛЯДА Віктар Антонавіч, загадчык кафедры фізічнага выхавання, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.** Цыкл прац «Псіхалогія фізічнай падрыхтоўкі моладзі».

У працы даследаваны пытанні псіхалогіі фізічнай падрыхтоўкі моладзі. У гэтым аўтар бачыць далейшае ўдасканаленне вучэбна-выхаваўчага працэсу па фізічнаму выхаванню і спорту. Асаблівае месца ў рабоце адводзіцца фарміраванню актыўнай і дзейнай асобы. Раскрываюцца найбольш істотныя пытанні матывацыі адносін валявых кампанентаў ва ўзаемасувязі з асноўнымі задачамі фізічнага выхавання і спорту. Значнасць працы заключаецца ў падрабязным вывучэнні мэт і задач living рознабаковай фізічнай падрыхтоўкі моладзі, павышэння функцыянальных магчымасцей маладога арганізма, а гэта значыць і стварэння ўмоў для ўдасканалення чалавека.

**Матэрыялы да друку падрыхтавала**
**В. СКРЭЖЭНДЗЕЎСКАЯ,**
**вядучы інжынер інфармацыйнай службы НДС.**

*Письма из Китая*

# «Я ПОЛЮБИЛА РУССКИЙ ЯЗЫК...»

**Заведующий кафедрой русского, общего и славянского языкознания нашего университета доцент В. И. Коваль теперь, в соответствии с договором, проходит стажировку в Пекинском railway пединституте.**

На одном из занятий я предложил студентам Пекинского пединститута, обучающимся на факультете русского языка, написать небольшое сочинение на тему «Почему я изучаю русский язык? Немного подумав, вспомнив необходимые слова и конструкции, они склонились над чистыми листами бумаги. Интересно, что же они напишут?..

«В средней школе были группы английского и русского языков, — пишет Ян Цзинь Чжао, — и я не знала, в какую группу мне поступать. Но мой отец предложил мне поступать именно в русскую группу. В свое время он окончил известный Пекинский университет «Сиань» и был учителем русского языка в школе. Но потом, когда отношения между Китаем и СССР осложнились, он не смог продолжать свою работу. Отец очень хотел, чтобы я изучала русский язык и говорила по-русски лучше, чем он. Я хорошо понимала отца, и поэтому поступила в русскую группу. Еще в школе я мечтала стать хорошей переводчицей, и сейчас эта мечта сильнее, чем раньше...».

По совету родителей стала изучать русский язык и Ли Линьлинь: «Когда я училась в школе, родители посоветовали мне выбрать русский язык. Сами они в институте изучали его, но с течением времени, к сожалению, забыли. Они хотели, чтобы я хорошо овладела русским языком. Я так и сделала, потому что была очень послушной девочкой, но теперь нисколько не жалею об этом. Изучая русский язык, я полюбила его. Часто я слушаю радиопередачи, смотрю фильмы на русском языке. Они мне очень нравятся».

На выбор специальности некоторых студентов повлияли их школьные учителя. Вот отрывок из сочинения Цуй Юн: «Наверное, судьба распорядилась так, что я изучаю русский язык. Я хорошо помню учительницу русского языка, которая учила нас первым русским словам. С того времени я полюбила русский язык. Я мечтаю своими глазами увидеть Москву, Красную площадь, проспекты, музеи. Может быть, моя мечта и не станет былью, но это моя самая большая мечта».

Фань Чжицян также впервые услышал русскую речь в школе от своего учителя, который рассказал ему много интересного о России, о русских людях. «Мои друзья по группе, — пишет он, — изучали русский язык в школе шесть лет, а я — только три года, поэтому мне труднее. Но я упорно учусь, чтобы не отстать от других».

Понятие « русский язык» неразрывно связывается студентами с представлениями об огромной стране, о ее народе, о ее богатой истории и культуре. Еще в школе они узнали о Пушкине, Тургеневе, Толстом, Горьком, о Чайковском, Глинке, о Третьяковской галерее. «Все это я хочу увидеть своими глазами, — пишет Чжоу Баошунь. — Здесь, в институте, я заложила хороший фундамент, чтобы осуществить свою мечту. Надеюсь, что после окончания института я смогу также свободно владеть русским языком, как и наши преподаватели».

«Честно говоря, — откровенно признается Цзань Циньцинь, — русский язык трудный, особенно трудно давалась мне русская фонетика. В школе я, как и другие, долго не могла научиться произносить звук «р», но, наконец, научилась. Прошло два года, как я учусь на факультете русского языка, и я чувствую, что стала лучше говорить и понимать русский язык, но все еще делаю ошибки. Научиться хорошо говорить по-русски — это моя большая мечта...».

Вань Лань изучает русский язык не только для того, чтобы получить нужную специальность: «Многие, известные всему миру произведения, написаны русскими писателями. Если я смогу читать их по-русски, это будет для меня большим счастьем». Кроме того, она считает, что русский язык — это язык дружбы: «Я знаю, что раньше между китайским народом и народами СССР была большая дружба, а потом отношения между нашими странами ухудшились. Но я хорошо знаю, что дружба между народами осталась, и сейчас она все больше развивается. Я изучаю русский язык, потому что хочу отдать все свои силы для укрепления дружбы между народами наших стран».

...Тихо в аудитории, только чуть слышен шелест бумаги. Китайские студенты, время от времени задумчиво поглядывая куда-то вдаль, пишут о русском языке...

**В. КОВАЛЬ,**
**преподаватель факультета русского языка Пекинского пединститута.**

# Аб платных паслугах ва універсітэце

**З мэтай павышэння адказнасці грамадзян за захаванне дыпломаў аб заканчэнні вышэйшай навучальнай установы, студэнтаў за захаванне студэнцкага білета і заліковай кніжкі, каб упарадкаваць выдачу дублікатаў вышэйназваных дакументаў і архіўнай даведкі аб знаходжанні ў ВНУ на падставе рашэння вучонага савета ГДУ ад 28 красавіка г.г. ва універсітэце ўведзены платныя паслугі за выдачу дублікатаў дакументаў.**

Устаноўлена тарыфная аплата за дублікаты і архіўныя даведкі ў наступных размерах:

— копій загадаў, рашэнняў і пастаноў, даведак, іншых дакументаў — 25 руб., і акрамя таго 5 руб. за кожную зробленую старонку;

— дыплом на замежнай мове для ад'язджаючых за мяжу — 500 руб.;

— дублікат дыплома замежнага ўзору — 400 руб.;

— копія дадатку да дыплома замежнага ўзору — 300 руб.;

— дублікат дыплома — 300 руб.;

— копія дадатку да дыплома — 200 руб.;

— дублікат заліковай кніжкі — 150 руб.;

— дублікат студэнцкага білета, пропуска ў інтэрнат, пасведчання супрацоўніка універсітэта — 50 руб.

За іншыя дадатковыя паслугі аплата праводзіцца на падставе разлікаў, праведзеных планава — фінансавым аддзелам і бухгалтэрыяй універсітэта.

**С. ПАШУК,**
**начальнік планава-фінансавага аддзела.**

## СПОРТ

# МАЛАЙЦЫ, КРАСМЕНЫ!

**Ў Магілёве прайшло першынство Беларускай студэнцкай Асацыяцыі па лёгкаатлетычнаму кросу, у якім прынялі ўдзел спартсмены больш 20 ВНУ.**

У бегу на 2 000 м вызначылася першакурсніца Алена Бычкоўская, якая стала пераможцай — 6.49,0 сек. Уладзімір Сівалобаў (2 курс) першынстваваў на дыстанцыі 8 000 м — 24.38,0 сек., а Ігар Мазепа (3 курс) заваяваў сярэбраную ўзнагароду на гэтай жа дыстанцыі — 24.38,3 сек.

У агульнакамандным заліку красмены нашага універсітэта заваявалі першынство — 534 ачкі, на другім месцы — Акадэмія фізічнага выхавання і спорту — 505 ачкоў і на трэцім — Брэсцкі педінстытут — 501 ачко.

Да гэтага дадам, што акрамя вышэй пералічаных студэнтаў факультэта фізічнай культуры за каманду выступалі: Наталля Васілеўская (1 курс), Марына Зырко (3 курс), Вольга Максімава (1 курс), Юрый Сакалоў (4 курс), Сяргей Цалуйка (2 курс) — усе з факультэта фізічнай культуры, а таксама Сяргей Раманькоў, які вучыцца на эканамічным факультэце.

Нагадаю нашым чытачам, што такі поспех у нашых красменаў быў толькі ў 1977 годзе. У гэтай сувязі назаву тых, хто рыхтаваў нашу каманду да рэспубліканскага кросу: кандыдаты педагагічных навук Г. Нарскін і В. Лемяшкоў, а таксама, ст. выкладчык Ф. Сырадоеў (усе з кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту).

# АДЗІН КРОК ДА МЕДАЛЁЎ

**У спорткомплексе БІІЧТу прайшоў першы фінальны тур чэмпіянату Рэспублікі Беларусь па валейболу сярод жаночых каманд.**

Валейбалісткі зборнай каманды Гомельскай вобласці, **у якую ўваходзілі нашы студэнткі і выкладчыцы — Валянціна Галаўко (выкладчыца кафедры фізічнага выхавання)**, Алена Вашчэткіна (3 курс) і першакурсніцы Аксана Акуневіч, Алена Казачэнка, **Галіна Пякурына перайгралі з аднолькавым** лікам 3:0 каманды Акадэміі фізічнага выхавання і спорту, Віцебскай вобласці, Рэспубліканскага вучылішча алімпійскага рэзерву, а таксама з лікам 3:1 нанеслі паражэнне валейбалісткам Гродзенскай вобласці.

У адной з цэнтральных сустрэч нашы дзяўчаты ўступілі камандзе вышэйшай лігі «Камунальнік» з Мінска — 0:3.

Тройка прызёраў пасля першага фінальнага тура выглядае наступным чынам: «Камунальнік» — 5 ачкоў, Гомельская вобласць — 4 і Гродзенская вобласць — 3 ачкі.

Заключны фінальны тур адбудзецца ў маі ў г. Гродне, дзе і будуць уручаны медалі чэмпіянату.

# УПЕРШЫНЮ ПЕРШЫЯ

**У доме фізкультуры і спорту прафсаюзаў прайшло рэспубліканскае першынство студэнцкай Асацыяцыі па вольнай барацьбе, у якім прынялі ўдзел 12 мацнейшых каманд ВНУ.**

На радасць гамяльчан першае агульнакаманднае месца заняла дружына асілкаў нашага універсітэта, на другім месцы — Акадэмія фізічнага выхавання і спорту (так цяпер называецца БДІФК) і на трэцім — зборная каманда Гродзенскага дзяржуніверсітэта.

У розных вагавых катэгорыях на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару ўзняліся студэнты факультэта фізічнай культуры ГДУ — Яўген Кульбакоў, Андрэй Барабанаў, Уладзімір Мацюшэнка і Андрэй Дземчанка.

На рахунку нашай каманды ёсць сярэбраныя і бронзавыя ўзнагароды.

Трэба падкрэсліць, што зборная дружына нашага універсітэта ўпершыню заваявала першае агульнакаманднае месца, а заслуга ў гэтым трэнерскага калектыву, які ўзначальвае загадчык кафедры фізічнага выхавання, дацэнт, майстар спорту па вольнай барацьбе Віктар Антонавіч Каляда.

Хочацца спадзявацца, што гэты поспех не выпадковы.

# ЗНОЎ ВУГАР АРУДЖАЎ

**У Будапешце завяршыўся чэмпіянат Еўропы па вольнай барацьбе, на якім зборная СНД заваявала чатыры залатыя медалі.**

Першакурснік факультэта фізічнай культуры, майстар спорту міжнароднага класа, чэмпіён свету-91 Вугар Аруджаў заваяваў сярэбраны медаль.

Зараз Вугар у Стайках рыхтуецца да чэмпіянату СНД, на якім будзе разыграна пуцёўка ў Барселону, а чэмпіянат пройдзе з 26 па 29 мая ў Маскве.

Жадаючы поспеху Вугару ў Маскве, нагадаю, што ён трэніруецца ў заслужанага трэнера Жоры Аруцюнавіча Джангірава.

**В. МАРЧАНКА.**

*Юрыдычная даведка*

# ДЫСЦЫПЛІНАРНАЕ СПАГНАННЕ

**Заканадаўства дакладна рэгламентуе віды ўздзеяння на парушальнікаў працоўнай дысцыпліны і парадак прымянення мер уздзеяння.** Артыкул 135 КЗаП Рэспублікі Беларусь прадугледжвае наступныя дысцыплінарныя спагнанні: заўвагі, вымову, строгую вымову, перавод на ніжэй аплачваемую работу на тэрмін да трох месяцаў або на ніжэйшую пасаду на той жа тэрмін, звальненне (па пунктах 3, 4, 7 і 8 арт, 33 КЗаП). Дысцыплінарныя спагнанні мае права накладаць кіраўнік прадпрыемства, установы, арганізацыі. Пры гэтым трэба ўлічваць цяжкасць зробленага ўчынку, абставін, пры якіх ён адбыўся, а таксама папярэднюю работу і паводзіны работніка. Да прымянення спагнання ад работніка павінна быць запатрабавана пісьмовае тлумачэнне. Адміністрацыя звязана пэўнымі тэрмінамі пры накладванні спагнання. Так, спагнанне прымяняецца непасрэдна за выяўленнем учынку, але не пазней чым праз месяц, не лічачы часу хваробы работніка або знаходжання яго ў водпуску. Спагнанне не можа быць накладзена пазней шасці месяцаў з дня, калі адбыўся ўчынак, а па выніках рэвізіі або праверкі фінансава-гаспадарчай дзейнасці — не пазней двух гадоў з дня яго ўчынення. За кожны ўчынак прымяняецца толькі адно дысцыплінарнае спагнанне. Само спагнанне абвяшчаецца ў загадзе, які даводзіцца да ведама працоўнага калектыву, а работніку абавязкова даводзіцца пад распіску. Калі на працягу года з дня накладання спагнання работнік не будзе падвергнуты новаму, то ён лічыцца не падвяргаўшымся дысцыплінарнаму спагнанню. Яно можа быць знята і да заканчэння года, калі пакараны не дапусціў новага парушэння працоўнай дысцыпліны і праявіў сябе як добрасумленны работнік.

На працягу тэрміну дзеяння дысцыплінарнага спагнання меры заахвочвання да работніа не прымяняюцца.

Адміністрацыя мае права пытанне аб парушэнні працоўнай дысцыпліны перадаць на разгляд працоўнага калектыву, таварыскага суда або грамадскай арганізацыі. Напрыклад, сход працоўнага калектыву можа абвясціць работніку таварыскую заўвагу або грамадскую вымову; прафсаюзны камітэт — любую з мер, прадугледжаную Статутам прафсаюзаў. Гэтыя меры ўздзеяння ўлічваюцца разам з дысцыплінарнымі спагнаннямі пры вырашэнні пытанняў аб звальненні за сістэматычнае невыкананне працоўных абавязкаў.

**В. РУПІН,**
**юрысконсульт ГДУ.**

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

**аб'яўляе прыём у аспірантуру ў 1992 годзе**

**З АДРЫВАМ АД ВЫТВОРЧАСЦІ**

**ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:**

матэматычная логіка, алгебра і тэорыя лічбаў; тэарэтычная фізіка; радыёфізіка; оптыка; фізіка цвёрдага цела; фізіка ядра і элементарных часцінак; батаніка; геафізіка; матэрыялазнаўства ў машынабудаванні; эканоміка, планаванне, арганізацыя кіраўніцтва народнай гаспадаркай і яго галінамі; беларуская мова; тэорыя і гісторыя педагогікі;

**БЕЗ АДРЫВУ АД ВЫТВОРЧАСЦІ:**

эканоміка, планаванне, арганізацыя кіравання народнай гаспадаркай і яе галінамі; эканоміка працы; эканоміка-матэматычныя метады; руская мова; тэорыя і методыка фізічнага выхавання, спартыўнай трэніроўкі і аздараўленчай фізкультуры.

Паступаючыя ў аспірантуру здаюць конкурсныя ўступныя экзамены па філасофіі, замежнай мове і спецыяльнай дысцыпліне ў аб'ёме дзейнічаючай праграмы для ВНУ.

Прыём дакументаў і субяседаванне з загадчыкамі кафедр або мяркуемымі навуковымі кіраўнікамі — да 10 верасня 1992 года.

Заява аб прыёме ў аспірантуру падаецца на імя рэктара з дадаткам: асабістага лістка па ўліку кадраў з 3-мя фотакарткамі; аўтабіяграфіі; характарыстыкі-рэкамендацыі з апошняга месца працы; копіі дыплома аб заканчэнні вышэйшай навучальнай установы і копіі выпіскі з заліковай ведамасці; спісу надрукаваных навуковых прац, вынаходніцтваў і справаздач аб навукова-даследчай рабоце, а пры іх адсутнасці — рэферата па выбранай навуковай спецыяльнасці; выпіскі з пратаколу пасяджэння вучонага савета для асоб, рэкамендаваных у аспірантуру вучонымі саветамі ВНУ (факультэтаў) непасрэдна пасля заканчэння вышэйшай навучальнай установы; пасведчання па форме 2.2 аб здачы кандыдацкіх экзаменаў для асоб, поўнасцю або часткова здаўшых кандыдацкія экзамены; меддаведкі (форма № 086-у), выпіскі з працоўнай кніжкі.

Уступныя экзамены праводзяцца з 1 па 30 кастрычніка 1991 года.

Дакументы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, аддзел аспірантуры. Тэл. 56-21-29.

**РЭКТАРАТ.**

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс па замяшчэнне вакантнай **пасады асістэнта па кафедры ВМ і праграміравання.**

Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Дакументы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

**Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў геолага-геаграфічнага факультэта смуткуюць з выпадку раптоўнай смерці на 62-м годзе жыцця дацэнта кафедры геафізікі ПАЎЛАВА Мікалая Фёдаравіча і выказваюць глыбокае спачуванне сям'і і родным нябожчыка.**

**Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры эканамічных тэорый выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту ГЕРАСІМЧЫКУ Мікалаю Вікенцьевічу ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю МАЦІ.**

**Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.**

**Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.**

**«Гомельскі універсітэт» — газета Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны.**
**Спонсар газеты — райсавет народных дэпутатаў Цэнтральнага раёна г. Гомеля.**

**Гомельская фабрыка «Палесдрук» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь г. Гомель, Савецкая, 1.**

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

**Аб'ём 1 друк. арк.**
**Тыраж 1.500 экз.**
**Заказ 306.**

**Падпісана да друку ў 15.00.**